# <u>Лэпбук: «Мая Беларусь»</u>




**<u>Аўтар:</u> Кавецкая Ала Станіславаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай ўстановы адукацыі «Вучэбна-педагагічны комплекс Іўеўскі яслі-сад-пачатковая школа»

Кантактная інфармацыя: 8 (029) 8858870; Kaveskaya69@mail.ru

**<u>Мэта:</u>** далучаць дзяцей да гісторыі і культуры беларускага народа; удакладняць веды пра сімвалы краіны, пазнаёміць з гербамі беларускіх гарадоў; раскрыць багацце і непаўторнасць роднага краю праз беларускія народныя промыслы, народныя цацкі; на прыкладзе забаўлянак, лічылак, гульняў; навучаць адчуваць прыгажосць беларускага маўлення; узбагачаць веды пра жывёл беларускіх лясоў; выхоўваць пачуццё гонару за сваю краіну, свой народ і родную мову, уважліва адносіцца да нацыянальных традыцый, фальклору.

**<u>Дыдактычны матэрыял:</u>**

<u>1) Набор картак і фотаздымкаў:</u>

- ✓ Цацкі беларускія
- ✓ Гербы гарадоў Беларусі
- ✓ Беларускія народным промыслы

- ✓ Жывелы Беларусі
- ✓ Беларускі дзіцячы фальклор

2) Схематычная выява дрэва Беларусі з гарадамі (лісцікамі)

**Правілы гульні:**

- ✓ Дзецям прапануецца падзяліцца на 5 групаў. Кожная группа разглядае набор фотаздымкаў (выхавальнік падыходзіць да кожнай группы і удзельнічае ў разважаннях)
- ✓ Пераможцам з'яўляецца той, хто правільна і прыгожа раскажа па дадзенаму набору фотаздымкаў
- ✓ Хто правільна называе вырабы беларускіх народных промыслаў, той атрымлівае фішку.

**Гульнявыя дзеянні:**

- ✓ Выбраць і ўставіць у вызначаную кішэньку фотаздымкі па тэмах
- ✓ Вызначыць, як называецца рэч і дзе яна ўжываецца, расказаць чым адрозніваюцца беларускія народныя промыслы
- ✓ Расказаць пра асаблівасці асяроддзя пражывання жывёл, пра асаблівасці звяроў беларускага лесу

**Варыянты гульні:**

✓ **"Хто больш убачыць"**

Перад дзецьмі фотаздымкі. Вядучы пытае: "Што вы бачыце?" Дзеці па чарзе адказваюць. Кожны павінен быць уважлівым, слухаць таварыша і працягваць яго расказ, не паўтараючы сказанага. Выйграў той, пасля каго ніхто нічога не можа сказаць.

✓ **"Адкажы хутка"**

Выхавальнік пытаецца: "Шэры, злы, зубасты – гэта?" і г.д. Дзеці адказваюць і знаходзяць фотаздымак.

✓ **"Паслухай і знадзі"**

Выхавальнік апісвае цацку, дзеці знаходзяць яе сярод іншых.

✓ **"Збяры герб"**

Выхавальнік прапануе дзецям гербы гарадоў Беларусі падзеляныя на некалькі частак. Дзеці па ўзоры павінны сабраць цэлую выяву.